УДК 94 (476.1) «1914/1917»

***В.В. Васіленка***

# УТВАРЭННЕ І ДЗЕЙНАСЦЬ МІНСКАГА ГУБЕРНСКАГА КАМІТЭТА УСЕРАСІЙСКАГА ЗЕМСКАГА САЮЗА ў 1914–1917 гг.

У прапанаваным артыкуле разглядаецца дзейнасць Усерасійскага земскага саюза дапамогі хворым і параненым воінам у беларускіх губернях Расійскай імперыі ў перыяд Першай сусветнай вайны. На прыкладзе Мінскай губерні на падставе новых дакументальных крыніц, якія раней не публікаваліся, разглядаюцца асноўныя напрамкі дзейнасці губернскага камітэта Земскага саюза ў 1914–1917 гг. Характарызуюцца асноўныя санітарна-медыцынскія мерапрыемствы, якія праводзіліся камітэтам у Мінскай губерні. Прыводзяцца дадзеныя аб дзейнасці ўрачэбна-харчавальнага пункта для ваяроў у Мінску, дадзеныя аб медыцынскіх установах камітэта і колькасці абсталяваных у іх ложкаў. У прадстаўленым матэрыяле таксама разглядаюцца вынікі працы па аказанні дапамогі бежанцам у губерні. Звяртаецца ўвага на дзейнасць камітэта па арганізацыі дапамогі рускім ваеннапалонным.

## Уводзіны

У пачатку Першай сусветнай вайны ліберальныя земцы аб'ядналіся і стварылі грамадскую арганізацыю – Усерасійскі земскі саюз (УЗС), які быў утвораны з мэтай аказання санітарна-медыцынскай дапамогі рускай арміі шляхам стварэння лазарэтаў, шпіталяў, перавязачных пунктаў, санітарных цягнікоў.

Арганізацыйнае афармленне УЗС адбылося 30 ліпеня 1914 г. у Маскве на з'ездзе ўпаўнаважаных губернскіх земстваў. Цэнтральным органам саюза з'яўляліся агульны сход упаўнаважаных земстваў, які абіраў галоўнаўпаўнаважанага, і Галоўны камітэт (ГК). Галоўнаўпаўнаважаным саюза быў абраны князь Г.Я. Львоў. Функцыі ГК заключаліся ў распрацоўцы агульных пытанняў і практычнай працы (эвакуацыя параненых, прылада шпіталяў, цэнтральных складоў, падрыхтоўкі медыцынскага персаналу і шэрагу іншых пытанняў) [1, с. 98]. У губернях ствараліся губернскія і павятовыя камітэты Земсаюза. Губернскі камітэт складаўся з 10 галосных, абраных губернскім земскім сходам. Таксама ў склад яго ўваходзілі ўсе сябры ўправы, па 1 прадстаўніку ад павятовых камітэтаў, па 1 прадстаўніку ад санітарнага бюро губернскага земства і губернскага санітарнага савета [2, с. 14]. Губернскі камітэт займаўся арганізацыяй планамернага размеркавання хворых і параненых воінаў па губерніі і павеце, стварэннем шпіталяў для іх лячэння, фінансаваннем павятовых камітэтаў [3, с. 97]. Афіцыйна УЗС быў прызнаны пасля дакладу міністра ўнутраных спраў цару і згоды імператара на яго дзейнасць, якая была атрымана 12 жніўня 1914 г. [4, арк. 100]. Да Земскага саюза далучыліся беларускія губерніі. Тут былі створаны губернскія і павятовыя камітэты. Адзін з іх – Мінскі губернскі камітэт.

Пытанне аб дзейнасці Усерасійскага земскага саюза на тэрыторыі беларускіх губерніяў у беларускай гістарычнай навуцы спецыяльна не распрацоўвалася. Эпізадычна дзейнасць УЗС разглядалася ў манаграфіі В.П. Слабажаніна [3]. Дзейнасць Земскага саюза па аказанні дапамогі бежанцам вывучалі ў сваіх працах С.Ф. Лапановіч і А.М. Бабкоў [5]. Мэта дадзенага артыкула – даследваць розныя бакі дзейнасці губернскага камітэта УЗС на тэрыторыі Мінскай губерніі ў 1914 – 1917 гг.

На сходзе мінскага губернскага земства 12 жніўня 1914 г. быў створаны губернскі камітэт УЗС. 14 жніўня на першым сходзе старшынёю быў абраны Б.М. Самойленка, а яго намеснікам – С.Б. Хржанстоўскі [6, с. 5]. Былі абраны члены камітэта. На 1 ліс-

Навуковы кіраўнік – Д.С. Лаўрыновіч, доктар гістарычных навук, дацэнт, першы прарэктар Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

тапада 1916 г. у склад камітэта ўваходзілі 17 чалавек [7, с. 55]. Перад камітэтам стаяла задача па арганізацыі ў губерніі санітарна-медыцынскіх устаноў і ўрачэбна-харчавальных пунктаў.

На сходзе 14 жніўня першым разглядалася пытанне аб стварэнні ўрачэбна-харчавальных пунктаў. Першы быў адчынены 28 жніўня ў Мінску каля шляхоў Лібава-Роменскай чыгункі. Ён складаўся з 5 вялікіх баракаў на 700 ложкаў і вялікай сталоўкі. Пры пункце была ўладкавана кухня са складамі і навесамі. У першыя дні праз пункт пра-ходзіла да 4 000 і больш хворых і параненых вайскоўцаў, затым колькасць іх знізілася да 300–600 чалавек у дзень. Усяго да 10 кастрычніка на пункце была аказана дапамога 60 000 хворым і параненым. Усе выдаткі на стварэнне, абсталяванне і ўтрыманне дадзенай установы ўзяў на сябе губернскі камітэт і Ваеннае ведамства [6, с. 6–7].

У Пінску з прыбыццём вялікай колькасці параненых склалася цяжкае становішча. 23 жніўня старшыня Мінскага губернскага камітэта атрымаў тэлеграму ад прадстаўніка земства І.А. Папа-Афанасапула. У тэлеграме паведамлялася, што ў Пінск штодня прыбывала да 5 000 параненых, галодных і без бялізны. Не хапала перавязачных сродкаў і персаналу. Арганізацый, якія аказвалі медыцынскую і харчавальную дапамогу вайскоўцам, у горадзе не было. Таму І.А. Папа-Афанасапула прасіў праз Галоўны камітэт УЗС арганізаваць тут урачэбна-харчавальны пункт. Пасля ўсіх перамоваў з ГК саюза, генерал-губернатарам, упраўленнем Чырвонага Крыжа ў Пінск быў адпраўлены шпіталь Чырвонага Крыжа. На першыя патрэбы губернскім камітэтам было выслана 5 000 руб. Таксама ў Пінск былі накіраваны 2 ваенныя шпіталі, а 6 верасня губернскі камітэт выслаў яшчэ 9 000 руб. Для арганізацыі ўрачэбна-харчавальнага пункта быў камандзіраваны генерал А.І. Несцяроўскі. Пункт пачаў працаваць ў кастрычніку. Такія ж пункты былі адчынены ў Брэст-Літоўску і Баранавічах [6, с. 9–10; 7].

Мінскі ўрачэбна-харчавальны пункт працаваў інтэнсіўна. З 28 жніўня 1914 г. па 1 сакавіка 1915 г. на пункце была аказана дапамога 159 000 вайскоўцам. Менш працаваў пункт у Пінску. Пункты ў Брэст-Літоўску і Баранавічах працавалі мала, бо параненыя тут практычна не выгружаліся, а следавалі транзітам. Толькі ў лютым 1915 г. пункты пачалі працаваць на поўную моц [8, с. 9].

Губернскі камітэт займаўся арганізацыяй лячэбных устаноў для лячэння хворых і параненых воінаў. Да канца 1914 г. у губерніі камітэтам былі арганізаваны шпіталі на 100 ложкаў пры хірургічнай земскай бальніцы і на 50 ложкаў пры харчавальным пункце. На сродкі графа К.Э. Храптовіч-Буцянёва ўтрымліваўся лазарэт на 40 ложкаў у маёнтку Шчорсы. Працаваў лазарэт на 12 ложкаў ў мястэчку Койданава і шпіталь на 100 ложкаў, абсталяваны пры вінным складзе ў Баранавічах [9, с. 55]. З студзеня 1915 г. у Мінску быў адчынены лазарэт на 240 месцаў для хворых дызентэрыяй, брушным і зваротным тыфам. У ім працавала 5 лекараў, сярэдні і ніжэйшы медыцынскі персанал [8, с. 10]. Да 1 лютага 1915 г. лячэбныя ўстановы на 550 месцаў ужо працавалі ў 7 населеных пунктах [10, с. 86–87, 258]. Колькасць ложкаў, створаных губернскім камітэтам у лячэбных установах, пастаянна павялічвалася. Да 1 траўня ў губерніі ў медыцынскіх установах УЗС было абсталявана 662 ложкі для хворых [11, л. 9]. Па дадзеных на 1 чэрвеня 1915 г. у Мінску функцыянавалі лазарэт на 50 ложкаў, інфекцыйны шпіталь на 300 ложкаў. Пры губернскай земскай бальніцы працаваў лазарэт на 50 ложкаў і псіхіятрычнае аддзяленне на 20. У Бабруйску працаваў лазарэт Чырвонага Крыжа і павятовага земства на 80 ложкаў. Лазарэт на 79 ложкаў дзейнічаў у Баранавічах, а таксама інфекцыйны барак на 25 ложкаў. У маёнтку Шчорсы графа К.Э. Храптовіча-Буцянёва працаваў лазарэт на 40 ложкаў для ваяроў. У Рэчыцы прымаў хворых і параненых лазарэт на 125 ложкаў [12, с. 116–117].

Аб санітарна-медыцынскіх установах Земскага саюза былі добрыя водгукі. Лячэбныя ўстановы ў губерніі ў пачатку ліпеня 1915 г. аглядаў губернскі ўрачэбны інс-

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

пектар С.Н. Урванцаў. У сваім дакладзе ён даў станоўчую характарыстыку заразнаму і халернаму баракам у Баранавічах, якія ўтрымліваліся на сродкі УЗС. Таксама ён звяртаў увагу на чысціню ў лазарэце, але казаў аб беднасці яго абсталявання [13, с. 158].

Начальнік санітарнай часці Заходняга фронту хадайнічаў аб адкрыцці губернскім камітэтам УЗС на станцыі Калінкавічы бальніцы для хворых і параненых воінаў. Бальніца на 50 месцаў была адчынена ў кастрычніку 1916 г., а ў студзені 1917 г. колькасць месцаў была павялічана да 75 [14, с. 126]. Для хворых, якія перанеслі тыф, губернскім камітэтам быў створаны санаторый на 40 месцаў. Ён знаходзіўся каля Мінска, на земскай дачы [15, арк. 58–58адв].

Для задавальнення ўсіх неабходных патрэб сваіх устаноў у медыцынскіх прыладах, медыкаментах, рэчах, бялізне ў Мінску былі створаны склад бялізны і медыкаментаў і аптэчны склад. Склад бялізны і медыкаментаў быў адчынены неадкладна. Да 20 верасня ім было нарыхтавана 11 500 камплектаў насільнай бялізны, 36 000 камплектаў пасцельнай бялізны, каля 10 000 адзінак дробнай бялізны, да 2 000 адзінак бялізны для медыцынскага персаналу, 2 000 туфляў, 2 000 цёплых коўдраў, 45 пудоў ваты. Калі стала вядома, што Мінскаму губернскаму камітэту прыйдзецца абслугоўваць Мінскую ваенную акругу, то склад пашырылі і павялічылі аб'ёмы нарыхтовак. Да кастрычніка на склад паступіла 162 500 камплектаў насільнай бялізны, 30 000 камплектаў пасцельнай бялізны, 158 000 адзінак дробнай бялізны (ручнікі, хусткі, шкарпэткі і інш.). Для медыцынскіх служачых і персанала было нарыхтавана 59 500 камплектаў бялізны. Цёплых рэчаў сабралі 6 000 адзінак, абутку – 18 500 адзінак, пальчатак, башлыкоў, шапак – 18 000 адзінак, цёплых халатаў – 25 000 адзінак, коўдраў – 2 500, ваты – каля 200 пудоў, 250 000 аршынаў марлі. Гэтыя рэчы былі дасланы Галоўным камітэтам УЗС [6, с. 8–9]. Мінскі склад сам рабіў нарыхтоўкі, закупаючы ўсё неабходнае ў мясцовых гандляроў і арганізацый. У канцы 1914 г. ім былі зроблены заказы на пастаўку 25 000 камплектаў цёплай бялізны, 25 000 цёплых ватных камізэлек, 15 000 пар ботаў, 11 000 ануч. Сума заказу скала 300 000 руб. [9, с. 54]. Ад пачатку дзейнасці і па 1 сакавіка 1915 г. праз склад прайшло featured рознага роду бялізны і пасцельных прыналежнасцяў 920 000 адзінак, адзення і цёплых рэчаў – 415 000 адзінак, 50 000 пар рознага абутку і футравых рэчаў, да 1млн аршынаў марлі [8, с. 10].

У кастрычніку 1915 г. губернскім камітэтам УЗС быў адчынены аптэчны склад. Ён атрымліваў усе медыкаменты ад Цэнтральнага аптэчнага склада ў Маскве. У першыя месяцы дзейнасць склада была нязначнай. У кастрычніку склад выканаў 10 заказаў па пастаўках і 1 платны для Рэчыцкага земства на 388 руб. У ліпені 1916 г. ён выканаў 138 заказаў на 30 604 руб. За перыяд з 1 студзеня па 1 ліпеня 1916 г. было выканана 812 заказаў на 167 058 руб. Гадавы абарот склада ў грашовым вылічэнні склаў 200 000 руб. [16, с. 31]. Земствы Мінскай губерніі ў 1914 – 1915 гг. на дзейнасць УЗС выдзелілі 419 356 руб. [17, с. 57].

Улетку 1915 г. у Мінскую губернію стала прыбываць шмат бежанцаў. Улады губерніі загадзя рыхтаваліся да іх прыёму. У адрас бабруйскага паліцмайстра Арлова ў сярэдзіне ліпеня 1915 г. паступіла тэлеграма з інфармацыяй аб колькасці бежанцаў для размяшчэння ў Мінскай губерніі. Лічба складала 100 000 чалавек [18, арк. 139]. Першымі бежанцамі, якія рухаліся летам праз Мінскую губернію, былі нямецкія каланісты. Яны перамяшчаліся па поўдні губерніі праз Пінскі, Мазырскі і Рэчыцкі паветы. Дапамогу ім аказвалі ваенныя ўлады, а таксама ўстановы франтавых камітэтаў УЗС і Усерасійскага саюза гарадоў (УСГ). Яны ладзілі харчавальныя пункты і медыцынскія ўстановы на чыгуначных станцыях [19, с. 132]. Акрамя каланістаў былі высяленцы-габрэі. Першыя іх партыі прыбылі ў Рэчыцу яшчэ ў лютым 1915 г. Праз месяц у горадзе быў арганізаваны камітэт дапамогі габрэям-бежанцам, колькасць якіх на працягу года

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

павялічылася да тысячы. Камітэт УЗС аказваў ім дапамогу, выдаючы з кастрычніка 1915 г. па 408 пайкоў у дзень [20, с. 202].

28 ліпеня 1915 г. адбылася «Асобая нарада па пытанні абсталявання ўрачэбна-харчавальных пунктаў для немцаў-каланістаў і бежанцаў, якія рухаліся праз Мінскую губернію транспартам па чыгунцы і грунтовых дарогах». На ёй прысутнічалі: кіраўніцтва губерніі, прадстаўнікі ваенных улад, медыцынскіх устаноў і служб губерніі, Чырвонага Крыжа, франтавога камітэта УЗС, ГК УЗС і УСГ і іншыя. Вырашылі ўскласці аказанне ўрачэбнай дапамогі немцам-каланістам па лініі чыгункі ад Пінска праз Лунінец да станцыі Мазыр-Калінкавічы на Саюз гарадоў. На лініі чыгункі Мазыр – Калінкавічы – Магілёўская губернія, а таксама па грунтавых дарогах у Пінскім, Мазырскім і Рэчыцкім паветах аказанне дапамогі ўскласці на Земскі саюз. Харчавальныя пункты трэба было стварыць на лініях Аляксандраўскай, Палескай, Лібава-Роменскай чыгунак на станцыях Баранавічы, Стоўбцы, Мінск, Нова-Барысаў, Пінск, Лунінец, Жыткавічы, Мазыр-Калінкавічы, Рэчыца, Асіповічы, Бабруйск. Па Маскоўска-Брэсцкай шашы адкрываць пункты ў Сіняўцы, Лубянцы, Ляхна, Кіевічах, Слуцку, Горках, Бабруйску. Нарада пастанавіла арганізаваць урачэбна-санітарную дапамогу бежанцам па лініі ўказаных чыгунак у Баранавічах, Стоўбцах, Нова-Барысаве, Пінску, Лунінцы, Жыткавічах, Мазыры-Калінкавічах, Рэчыцы, Асіповічах і Бабруйску [21, арк. 443–443адв, 444].

Чакаючы наплыву бежанцаў у Мазырскі і Рэчыцкі паветы, мінскі губернатар загадаў распрацаваць план па арганізацыі ў паветах ўрачэбна-харчавальных пунктаў. На пасяджэнні Рэчыцкага павятовага земства былі акрэслены 2 шляхі перамяшчэння бежанцаў. Першы шлях праходзіў з Мазыра на Калінкавічы праз вёскі Даманавічы, Якімаву Слабаду з пераправай праз раку Бярэзіну ў Магілёўскай губерніі. Другі шлях праходзіў з Мазырскага павета з пераправай праз раку Прыпяць каля Нароўлі і Барбарава і затым на Юравічы, Хойнікі, Брагін. Далей – па трох напрамках у Чарнігаўскую губерню. Размеркавальныя пункты ствараліся ў Калінкавічах, Нароўлі, Барбараве, Брагіне. Ладзіліся 9 санітарна-харчавальных пунктаў. З ваеннага фонду на гэта было выдаткавана 266 000 руб. [22, с. 81].

Начальнік забеспячэння Паўночна-Заходняга фронту прапанаваў земству арганізаваць дапамогу бежанцам па дарозе ў напрамку Ігумен – Беразіна і далей. У першых днях верасня па гэтым пытанні адбылося пасяджэнне губернскага камітэта. Вырашылі разам з франтавым камітэтам УЗС арганізоўваць урачэбна-харчавальныя пункты для бежанцаў. Абслугоўванне харчаваннем браў на сябе франтавы камітэт, а санітарна-медыцынскае – губернскі. 2 верасня быў адчынены ўрачэбна-назіральны пункт у вёсцы Грачынь, а 8-га – такі ж пункт у Новым Двары. 20 верасня ў Мінску ў раёне Віленскага вакзала быў адчынены харчавальны пункт, дзе да 1 лютага 1916 г. бежанцам было выдадзена 201 635 абедаў. Недалёка размяшчалася гарбатная, у якой было выдадзена бежанцам да 1 лютага 293 562 порцыі гарбаты з цукрам. У будынку насупраць харчавальнага пункта быў абсталяваны прытулак для жанчын і дзяцей на 130 месцаў, дзе да 1 лютага ўкрывалася 2 456 чалавек. Для дзяцей была ўладкавана сталовая на 400 чалавек і школа. Да 1 лютага 1916 г. у сталоўцы было выдадзена 10 163 абеды. Побач адчынілі амбулаторыю і зубалячэбны кабінет. 6 кастрычніка ў Даманавічах быў адчынены ўрачэбна-назіральны пункт, у Рэчыцы для бежанцаў была пабудавана лазня.

На ўсе гэтыя мерапрыемствы сродкі ў памеры 100 000 руб. былі атрыманы з ваеннага фонду ад генерала М.І. Данілава. Губернскі камітэт УЗС забяспечваў установы медыкаментамі, бялізнай, персаналам, абозамі. Прадукты харчавання і фураж атрымлівалі з інтэндансkіх складоў [23, арк. 129–132, 134, 137].

Пасля спынення актыўных баявых дзеянняў на фронце бежанцы сталі вяртацца ў родныя мясціны. Правадыр Навагрудскага павятовага дваранства паведамляў, што бежанцаў далей Стоўбцаў не пускалі і не дазвалялі заставацца ў горадзе. Паўстала праб-

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

лема забеспячэння гэтых бежанцаў харчаваннем і фуражом. Ён прасіў арганізаваць Земскі саюз, або «Паўночдапамогу», рухомыя харчовыя пункты [24, арк. 105–105адв].

З сакавіка 1916 г. губернскі камітэт займаўся барацьбой з заразнымі хваробамі. Сітуацыя абвастрылася з-за вялікай колькасці раскватараваных у губерніі войскаў і бежанцаў, якіх тут налічвалася да 120 000 чалавек. Для барацьбы з захворваннямі былі створаны 10 эпідэмічных атрадаў. Служачыя атрадаў ладзілі баракі для хворых, амбулаторыі, лазні. Медыцынскія работнікі праводзілі дэзынфекцыйныя мерапрыемствы. Па-сля тыфу з ліпеня эпідэмічныя атрады сталі змагацца з дызентэрыяй [16, с. 1–4].

У 1916 г. губернскі камітэт у асноўным займаўся аказаннем дапамогі аселым бежанцам, арганізоўваючы ўрачэбна-назіральныя і ўрачэбна-харчавальныя пункты. У ліпені камітэт прыняў ад Камітэта Заходняга фронту УЗС установы, якія абслугоўва-лі бежанцаў. Гэта былі ўрачэбна-харчавальныя пункты ў Ігумене, Смілавічах, Нова-Барысаве, Смалявічах, 2 у Мінску, Мазыры, Жыткавічах, Капцэвічах, Сянкевічах, Мікашэвічах, Рэчыцы, Калінкавічах, 2 у Бабруйску, Асіповічах, Багушоўцы, Парычах. У Бабруйску былі прыняты дэзынфекцыйны атрад, зубалячэбны кабінет і 2 ізаляцыйныя бальніцы [16, с. 4–5]. На працягу 1916 г. губернскі камітэт адчыніў 36 розных устаноў. У асноўным гэта былі ўрачэбна-назіральныя, урачэбна-харчавальныя пункты, эпідэмічныя атрады з баракамі і бальніцамі [16, с. 6–7].

Для дзяцей бежанцаў і сірот губернскім камітэтам ва Ухце Навагрудскага павета і ў Навінках Мінскага павета і былі адчынены прытулкі (ў Навінках са школай і пераплётнай майстэрняй). Пазней прытулак з Навінак перавялі ў Яхімава. Пры ім былі арганізаваны шавецкая, сталярная і рукадзельная майстэрні. Прытулак са школай і майстэрняй па вырабе кошэкаў быў адчынены ў Рэчыцы. У Пінскім павеце, у Востраве, для дзяцей-бежанцаў быў адчынены інтэрнат. Ад франтавога камітэта УЗС быў прыняты пры-тулак у Мінску [16, с. 5]. У прытулках дзеці былі пад наглядам, накормлены, наведвалі школу і майстэрню, дзе навучаліся якому-небудзь рамяству.

За 1916 г. у санітарна-медыцынскіх установах лячэнне атрымалі: у бальніцы 9 850 і амбулаторна 152 945 хворых. На харчавальных пунктах харчаваліся штодзень 20 000 бежанцаў [16, с. 17, 29].

Санітарна-медыцынская дзейнасць Мінскага губернскага камітэта УЗС пашыралася разам з сеткай устаноў. На 1 студзеня 1917 г. было 3 лазарэты для лячэння воінаў, 8 урачэбна-назіральных пунктаў, 13 урачэбна-харчавальных пунктаў. У губерніі працавалі 9 эпідэмічных атрадаў камітэта і 4 зубалячэбныя кабінеты. Было 3 харчавальныя пункты і 3 крамы, 6 лазняў, 2 пральні. Губернскі камітэт УЗС утрымліваў 5 прытулкаў для дзяцей бежанцаў, а таксама 3 інтэрнаты і 1 патранат, пякарню, майстэрню, аптэчны і рэчавыя склады. У медыцынскіх установах было абсталявана 1 170 ложкаў, з іх 175 хірургічных, 575 інфекцыйных і 420 звычайных [16, с. 8–11, 19].

У першыя месяцы вайны шмат рускіх салдат і афіцэраў патрапілі ў палон. Таму з'явілася патрэба ў пошуку расійскімі, ўладамі і сваякамі палонных і аказання ім разнастайнай дапамогі. Земсаюз стаў арганізоўваць дапамогу рускім ваеннапалонным. Восенню 1915 г. пры Галоўным камітэце быў створаны аддзел дапамогі ваеннапалонным. Ім стаў загадваць В.П. Обнінскі. Галоўны камітэт звярнуўся да ўсіх губернскіх камітэтаў, каб тыя стварылі аддзелы дапамогі ваеннапалонным. Камітэт пазначыў задачы ў справе дапамогі ваеннапалонным: 1) навядзенне даведак аб ваеннапалонных; 2) адпраўка лістоў ваеннапалонным; 3) адпраўка грашовых пераводаў і іншых відаў дапамогі; 4) адпраўка паштовак ваеннапалонным; 5) уведамленне насельніцтва аб рабоце Земскага саюза; 6) прыём ахвяраванняў грашыма [25, с. 4–6]. Акрамя гэтага трэба было прыцягнуць мясцовае насельніцтва да аказання дапамогі ваеннапалонным. Вялікай колькасці людзей трэба было дапамагчы адшукаць сваіх родных, якія знаходзіліся ў ла-

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

герах для ваеннапалонных, і дапамагчы з імі звязацца. Гэтым сталі займацца на месцах аддзелы губернскіх камітэтаў.

Для інфармавання насельніцтва аб прынцыпах работы па аказанні дапамогі ваеннапалонным друкаваліся плакаты. На іх была змешчана інфармацыя аб тым, як можна атрымаць звесткі пра месцазнаходжанне ваеннапалоннага, куды звярнуцца, каб адправіць яму ліст, перавесці грошы, пераслаць рэчы і харчовыя запасы [26, с. 1]. Акрамя гэтага Галоўным камітэтам выдаваліся брашуры са спісамі адрасоў лагераў для ваеннапалонных у Германіі і Аўстра-Венгрыі на рускай і нямецкай мовах [27]. Такую інфармацыю распаўсюджвалі мясцовыя камітэты. Мінскі губернскі камітэт УЗС выдаў вясной 1916 г. 500 плакатаў з правіламі зносін з ваеннапалоннымі, а таксама 50 брашур са спісамі месцаў утрымання рускіх ваеннапалонных [15, арк. 214адв].

Аддзел дапамогі ваеннапалонным Мінскага губернскага камітэта УЗС працаваў не актыўна. З данясення ў Галоўны камітэт УЗС у снежні 1917 г. вынікала, што аддзел пачаў працаваць у канцы 1916 г. Ён выдаваў даведкі аб ваеннапалонных, а таксама рабіў заказы на паштоўкі для іх. Паштоўкі адпраўляліся праз Галоўны камітэт Земсаюза. Збор ахвяраванняў аддзел не праводзіў і ніякіх субсідый ад арганізацый не атрымліваў. Выданняў, брашур і заклікаў аддзел не рабіў. Адной з прычын пасіўнай працы было тое, што Мінскі губернскі камітэт знаходзіўся ў прыфрантавой зоне і ўсякая ініцыятыва аддзела сустракала перашкоды з боку ўлад [28, арк. 109–109адв].

**Заключэнне**

Каб мець уяўленне аб маштабе дзейнасці Мінскага губернскага камітэта, трэба параўнаць яго дзейнасць з іншымі губернскімі камітэтамі, з УЗС, УСГ, Ваенным ведамствам і Расійскім таварыствам Чырвонага Крыжа.

Земскім саюзам да 1 лютага 1915 г. было абсталявана па-за фронтам 143 829 ложкаў і 171 519 разам з фронтам [29, с. 41]. Як было паказана, да 1 лютага 1915 г. Мінскім губернскім камітэтам у губерніі было абсталявана 550 ложкаў у медыцынскіх установах. На 1 траўня было ўжо 662 койка-месцаў. У параўнанні з агульнымі лічбамі па саюзе гэта вельмі мала. Калі параўноўваць з лічбамі губерній тылу, то карціна іншая. Больш усяго было абсталявана койка-месцаў у медыцынскіх установах Варонежскай губерніі – 6 453 [10, с. 258]. Гэта тлумачыцца тым, што Варонежская губернія знаходзілася ў тыле, не несла вялікіх нагрузак і мела большыя матэрыяльныя рэсурсы. Яна знаходзілася ў 2 лініі эвакуацыі, дзе ствараліся стацыянарныя медыцынскія ўстановы для лячэння параненых і хворых. У параўнанні з беларускімі губерніямі ў Магілёўскай, напрыклад, камітэтам было абсталявана да 1 лютага 1 344 ложкі [10, с. 258]. У Віцебскай губерніі да 1 траўня было абсталявана камітэтам УЗС 740 ложкаў [11, арк. 9]. Чым тлумачылася меншая колькасць абсталяваных ложкаў у Мінскай губерніі? Мінская губернія была тылам фронту і ўваходзіла ў Мінскую ваенную акругу. На тэрыторыі губерніі і ў Мінску былі раскватэраваны войскі, размяшчаліся ўстановы Ваеннага ведамства, тылу фронту, цывільных улад, разнастайных дабрачынных арганізацый. Акрамя гэтага з лета 1915 г. у губерніі размяшчалася частка эвакуіраваных з польскіх губерній і Гродзенскай губерніі цывільных і іншых устаноў і дзесяткі тысяч бежанцаў. Такія абставіны ўскладнялі працу губернскаму камітэту УЗС.

Калі параўноўваць дзейнасць Мінскага камітэта УЗС з іншымі арганізацыямі і ведамствамі, то вылучым Ваеннае ведамства, Расійскае таварыства Чырвонага Крыжа, Усерасійскі саюз гарадоў. Ваеннае ведамства да 1 студзеня 1916 г. стварыла для хворых і параненых 160 000 ложкаў у медыцынскіх установах [30, с. 11]. УСГ да 1 кастрычніка 1915 г. абсталяваў у гарадах Расіі 174 442 ложкі [31, с. 62]. Расійскае таварыства Чырвонага Крыжа да 1 студзеня 1916 г. на фронце стварыла 44 600, а ў тыле – 61 247 ложкаў для лячэння ваенных [32, с. 63]. На фоне гэтых арганізацый нават лічба

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

1 170 ложкаў, абсталяваных Мінскім губернскім камітэтам да 1 студзеня 1917 г. з'яўляецца, на нашу думку, даволі вялікім паказчыкам. Тым больш, што ў бліжэйшым тыле фронту не планавалася ствараць шмат санітарна-медыцынскіх устаноў. У прыфрантавых губернях медыцынскія ўстановы ствараліся як фільтры, у якіх хворыя і параненыя размяшчаліся часова і размяркоўваліся па катэгорыях, а далей перамяшчаліся ў тыл, у стацыянарныя медыцынскія ўстановы, асабліва цяжкапараненыя. Інфекцыйныя хворыя затрымліваліся.

Калі казаць аб аказанай губернскім камітэтам дапамозе бежанцам, то трэба адзначыць, што першапачаткова дапамогу бежанцам з лета 1915 г. аказвалі франтавыя камітэты УЗС і УСГ. Да іх спачатку звярталіся ваенныя ўлады і выдзялялі фінансавыя сродкі на гэтыя мэты, бо ў франтавых камітэтаў ужо існавала сетка медыцынскіх і харчавальных устаноў. І толькі ў другой палове 1916 г. большую частку сваіх устоноў яны перадалі мясцовым губернскім камітэтам. Па дадзеных франтавога камітэта УСГ, у студзені 1916 г. на яго харчавальных пунктах харчавалася 35 418 бежанцаў. Установы франтавога камітэта УЗС дапамагалі 140 933 бежанцам [33, с. 85–86]. Губернскі Мінскі камітэт харчаваў да 20 000 бежанцаў штодзень. Такім чынам, губернскі камітэт дапамагаў меншай колькасці бежанцаў у другой палове 1915 г., чым франтавыя, а ў 1916 г. сканцэнтраваўся на дапамозе аселым бежанцам у губерніі, якіх было да 120 000 чалавек. І яго дзейнасць пашырылася ў гэтым напрамку.

Такім чынам, мінскае земства далучылася да УЗС, утварыла губернскі камітэт. Дзейнасць яго была рознапланавай: былі ўтвораны ўстановы санітарна-медыцынскага і харчавальнага плану. Дапамога аказвалася салдатам і афіцэрам, а таксама бежанцам, ваеннапалонным і мясцоваму насельніцтву.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Загряцков, М. Всероссийский земский союз / М. Загряцков // Земское дело. – 1915. – № 2. – С. 91–103.
2. С.В. История возникновения Всероссийского Земского Союза / С.В. // Вестник могилёвского земства. – 1915. – № 8. – С. 12–15.
3. Слобожанин, В.П. Земское самоуправление в Беларуси (1905–1917 гг.) / В.П. Слобожанин ; под науч. ред. акад. Н.Г. Никитенко и В.П. Изотко. – Минск : ИООО «Право и экономика», 2003. – 168 с.
4. О разрешении деятельности Всероссийского земского союза помощи больным и раненым воинам, о предоставлении министру права приостанавливать выборы в западных губерниях, назначении служащих, о переименовании улиц, мостов, площадей в разных городах, о выдаче пособий разным лицам и др. (1914 г.) // РДГА. – Фонд 1284. – Воп. 241. – Спр. 179.
5. Лапановіч, С.Ф. Удзел Усерасійскага земскага саюза і саюза гарадоў у аказанні дапамогі бежанцам у Беларусі (1914–1917 гг.) / С.Ф. Лапановіч // Беларус. гістар. часопіс. – 2007. – № 6. – С. 9–17; Лапановіч, С.Ф. Узаемаадносіны дзяржаўных устаноў і грамадскіх арганізацый у справе аказання дапамогі бежанцам у Расійскай імперыі ў гады Першай сусветнай вайны (1914–1916) / Лапановіч, С.Ф. // Вестник Акад. МВД Респ. Беларусь. – 2008. – № 1. – С. 22–27; Лапановіч, С.Ф. Аказанне дапамогі бежанцам у Беларусі ў перыяд кіравання Часовага ўрада (сакавік–кастрычнік 1917 г.) / С.Ф. Лапановіч // Весці БДПУ імя М. Танка. Сер. 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2008. – № 3. – С. 17–20; Лапановіч, С.Ф. Дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам у Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны (1914 – кастрычнік 1917 г.) / С.Ф. Лапановіч. – Мінск : Акад. МУС, 2010. – 127 с.; Бабков, А.М. Беженцы в Белоруссии в годы Первой мировой


Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

войны (1915–1916) / А.М. Бабков // Гістар. навука і гістар. адукацыя ў Рэсп. Беларусь (новыя канцэпцыі і падыходы) : Усебел. канф. гісторыкаў, Мінск, 3–5 лютага 1993 г. : у 2 ч. – Мінск : Універсітэцкае, 1994. – Ч. 1 : Гісторыя Беларусі. – С. 131–138; Бабкоў, А.М. Бежанцы на Гомельшчыне ў гады Першай сусветнай вайны (1915–1916) / А.М. Бабкоў // Гомельшчына: старонкі мінулага : нарысы / Гомел. дзярж. ун-т. імя Ф. Скарыны; рэдкал.: Р.Р. Лазько [і інш.]. – Вып. 2. – Гомель, 1996. – С. 78–83.

6. Организация помощи семьям, призванным на военную службу и больным и раненым воинам // Вестник Минского губернского земства. – 1914. – №10. – С. 3–12.

7. Личный состав учреждений Всероссийского земского союза. (На 1 ноября 1916 г.) / Всероссийский земский союз. – М., 1916. – 118 с.

8. Из деятельности Минского Губернского Комитета по оказанию помощи больным и раненым воинам // Вест. Минского губернского земства. – 1915. – № 3. – С. 9–12.

9. Местная хроника // Вест. Минского губернского земства. – 1914. – № 12. – С. 53–57.

10. Список госпиталей, состоящих на учёте Всероссийского земского союза (на 1-е февраля 1915 г.) / Всероссийский земский союз помощи больным и раненым воинам. Отдел эвакуации. – Изд. 1-е. – М., 1915. – 258 с.

11. Записки о деятельности Земского Союза по организации врачебно-санитарной помощи армии по обеспечению солдат одеждой, бельём, обувью. Здесь же ведомости госпиталей и коек, находящихся в ведении Всероссийского Земского Союза (1915–1916 гг.). [Машинописные копии] // РДГА. – Фонд 1090. – Воп. 1. – Спр. 21.

12. Список госпиталей, состоящих на учёте Всероссийского земского союза (на 1-е июня 1915 г.). – Изд. 2-е. – М., 1915. – 430 с.

13. Хроника // Минские врачебные известия. – 1915. – № 7–8. – С. 158–159.

14. Лякин, В.А. Калинковичи на перекрёстке дорог и эпох : исторический очерк / В.А. Лякин. – Мозырь : Белый ветер, 2010. – 130 с.

15. Переписка с уполномоченными комитета в уездах об организации врачебно-наблюдательных пунктов, эвакуации приютов и др. Списки учреждений ВЗС, содержащихся на средства в помощь беженцам // НГАБ. – Фонд 700. – Воп. 1. – Спр. 42.

16. Краткий отчёт о деятельности Минского Губернского Комитета ВЗС за 1916 г. – Минск : Типография Б.Л. Каплана, 1917. – 32 с.

17. Ассигнования губернских и уездных земств на нужды, вызванные войной. – М. : Типография Рябушинских, 1916. – 215 с.

18. Дело об устройстве питатель-ных, врачебных и сортировочных пунктов для беженцев // НГАБ. – Фонд 295. – Воп. 1. – Т. 3. – Спр. 9031.

19. Лапановіч, С.Ф. Аказанне дапамогі бежанцам у Мінскай губерніі летам–восенню 1915 г. / С.Ф. Лапановіч // Айчынная і сусветная гісторыя: сучасныя погляды і метады даследвання : зб. навук. прац : у 2 ч. / Бел. дзярж. пед. ун-т. імя М. Танка; рэдкал.: А.М. Люты (гал. рэд.) [і інш.]. – Ч. 1. : Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі. – Мінск : БДПУ, 2002. – С. 131–138.

20. Каганович, А. Речица. История еврейского местечка Юго-Восточной Белоруссии / А. Каганович. – Иерусалим, 2007. – 447 с.

21. Обязательные постановления и объ-явления начальника Минского военного округа, Минского губернатора, циркуляры де-партамента полиции и Минского губернатора о правилах торговли, учёте продовольст-вия, вывозке топлива и розыске и поимке дезертиров и организации врачебно-питатель-ных пунктов и др. // НГАБ. – Фонд 300. – Воп. 1. – Спр. 65.

22. Бабкоў, А.М. Бежанцы на Гомельшчыне ў гады Першай сусветнай вайны (1915–1916) / А.М. Бабкоў // Гомельшчына: старонкі мінулага : нарысы / Гомел. дзярж. ун-т. імя Ф. Скарыны; рэдкал.: Р.Р. Лазько [і інш.]. – Вып. 2. – Гомель, 1996. – С. 78–83.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

23. Медицинский отчёт Минского губернского комитета за 1915 г. // НГАБ. – Фонд 700. – Воп. 1. – Спр. 10.

24. Дело о размещении беженцев и оказание материальной и медицинской помощи им. // НГАБ. – Фонд 295. – Воп. 1, т. 3. – Спр. 8986.

25. В губернские, уездные и областные комитеты Всероссийского земского союза [О помощи военнопленным] / Всероссийский земский союз. – М., 1915. – С. 6.

26. От Всероссийского земского союза. О помощи, находящимся в плену русским воинам / Всероссийский земский союз. – М., 1915 – С. 1.

27. Списки мест водворения военнопленных в Германии и Австро-Венгрии / Главный комитет Всероссийского земского союза. – М. : Типография П.П. Рябушинского, 1916. – 50 с.

28. Переписка с Главным комитетом ВЗС о посылках для военнопленных, заказанных через Отдел помощи военнопленным // НГАБ. – Фонд 700. – Воп. 1. – Спр. 185.

29. Обзор деятельности Главного комитета. 1 августа 1914 г. – 1 февраля 1915 г. : Представлен Собранию уполномоченных губернских земств 12 марта 1915 г. / Всероссийский земский союз помощи больным и раненым воинам. – М., 1915. – 411 с.

30. Краткий очерк деятельности Всероссийского земского союза. Январь 1916 г. / Главный комитет Всероссийского земского союза. – М., 1916. – 52 с.

31. Очерк деятельности Всероссийского союза городов в 1914–1915 гг. – М., 1916 – 239 с.

32. Ерошенко, А.П. Россия в Первой мировой войне (1914–1918 гг.): Военно-санитарная деятельность Российского общества Красного Креста / А.П. Ерошенко, А.А. Черкасов // История и историки в контексте времени. – 2010. – Вып. 7. – С. 60–72.

33. Лапановіч, С.Ф. Дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам у Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны (1914 – кастрычнік 1917 г.) / С.Ф. Лапановіч. – Мінск : Акад. МУС, 2010. – 127 с.

***Vasilenko V.V.* Formation and Activity of the Minsk Provincial Committee of All-Russian Zemstvo Union in 1914–1917 years**

This article describes the activities of the Russian Union of Cities of the sick and wounded soldiers (RUC) in the Belarusian provinces of the Russian Empire during the First World War. On the example of the Minsk province on the basis of new, not previously published documentary sources the main activities of the provincial committee of the Cities Alliance in 1914–1917 were investigated. Primary health and medical activities undertaken by the Committee in Minsk and province were considered and characterized. The number of equipped beds in medical institutions established by the Committee on the activities of the medical and nutritional point for soldiers in Minsk was illustrated. The submission also examines the work of the refugee assistance. Also the attention was paid to the activities of the Committee for organizing help to disabled soldiers and Russian the prisoners of war.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 10.02.2014

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова